## «Вайна»

Вайна пад гром дзвярэй сарваных,
Пад стрэлы выбітага шкла
За коўдрай з дыму і туману
Калыску хлопчыка знайшла.
І, каб не даць малому бачыць,
У бляск нявінных вачанят
Над самым тварыкам дзіцячым
Нацэліў вока аўтамат.
Усё гарэла…
І на мушцы пажар вясёлкаю бліснуў
Малы ўзняўся на падушцы
І цёплай ручкай ствол крануў.
Асеў дрыготка лёд сталёвы,
Па пальцах кропля папаўзла,
Салдат у плачы хмурыў бровы,
Са сталі капнула сляза.

## «Перада мною бераг Нарачанкі»

Перада мною бераг Нарачанкі,
Вілейшчына ачнулася ад сна.
Балоты, пушчы Беларусі – партызанкі,
А нада мною неба, сонца і вясна.
Цвілую твань маланкі смаляць,
І хлеб замешваюць дажджы,
Геройскі час Пярун салютам славіць,
Пішчаць умлелыя смаўжы.
Я станаўлюся перад лесам на калені:
Зямля дзядоў, за што ты толькі носіш нас?
Ці вартыя мы партызанскіх пакаленняў
І чым уславім гістарычны час?